Ажыгін С.І.,
дацэнт

# З ГІСТОРЫІ ВЫКАНАННЯ МУЗЫЧНЫХ ТВОРАЎ НА ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАХ У БЕЛАРУСІ

Методыка навучання ігры на музычным інструменце з'яўляецца часткай музычнай педагогікі.

Методыка навучання ігры на духавых інструментах даволі "маладая". Музыкантаў-духавікоў у асноўным для аркестраў рыхтавалі Маскоўская і Пецярбургская кансерваторыі.

Але нельга лічыць, што ў Беларусі адсутнічала музычнае жыццё. Аб гэтым сведчыць народны артыст РБ А.В.Багатыроў у артыкуле "Мае планы -- напісаць новую оперу і ўбачыць, як пачнецца XXI век": "...Віцебск... быў горад сур'ёзнай музыкі і адукаванай, інтэлігентнай публікі... У яго залах выступалі Рахманінаў і Зілоці, Нежданава і Собінаў, Пабла Сарасатэ і Йосіф Гофман. Адзін месяц у годзе абавязкова гастралявала італьянская опера... Наладжваліся вечары, пастаяннымі ўдзельнікамі якіх былі выдатны дырыжор, тагачасны рэктар Віцебскай народнай кансерваторыі Мікалай Малько..." (Народная газета. -- 1993. -- 4--6 верасня).

У Віцебску з 1918 г. па 1921 г. існаваў 1-шы ў Беларусі сімфанічны аркестр, заснавальнікам і кіраўніком якога быў М.А.Малько. За два з паловай гады аркестр даў 240 канцэртаў.

Аднак афіцыйна прынята лічыць пачаткам музычнай адукацыі адкрыццё Мінскага музычнага тэхнікума ў 1924 г.

У 1932 г. распачала сваю дзейнасць беларуская кансерваторыя.

Выкладчыкамі ў тэхнікуме, а потым і ў кансерваторыі працавалі такія вядомыя музыканты, як Патрабняк Мікіта Раманавіч (фагот), Папавейкі Георгій Канстанцінавіч (габой), Сцэгенны Ян Іосіфавіч (валторна), Бакун Іван Іванавіч (кларнет), Маркоўскі Сцяпан Сцяпанавіч (ударныя) і іншыя.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны выкладалі ігру на духавых інструментах Рубанчык Якаў Ілыч (трамбон), Цёмкін Юрый Саламонавіч (габой), Харытонаў Уладзімір Васільевіч (флейта), Кандрашоў Арцямен Сямёнавіч (фагот), Дзянісаў Павел Ферапонтавіч (труба).

Вучні гэтых выкладчыкаў з'яўляліся і з'яўляюцца зараз выкладчыкамі навучальных устаноў, салістамі і артыстамі вядучых аркестраў.

Многія з іх маюць ганаровыя дзяржаўныя і навуковыя званні: засл.арт.УССР прафесар У.М.Апацкі (фагот), засл.арт.БССР прафесар У.У.Будкевіч ( фагот), Я.К.Лосеў (кларнет), дацэнт Л.Р.Акапджанян (кларнет), засл.арт.БССР Р.В.Ігнацьеў (кларнет), дацэнт Н.В.Аўраменка (флейта), Г.Я.Гедыльтэр (флейта), засл.арт.БССР В.П.Ціхевіч (флейта), засл.арт.БССР М.Н.Баркоўскі (габой), дацэнт Р.А.Лагонда, засл.дзеяч культуры БССР А.І.Каладзёнак (флейта), дацэнт Юрцэвіч Ф.В. (флейта) і іншыя.

Што датычыцца народных духавых інструментаў, то навучанне на іх у навучальных установах да апошняга часу амаль цалкам адсутнічала, хаця народныя духавыя інструменты ў народных і фальклорных калектывах выкарыстоўваліся шырока. Адсутнічаў і выраб іх ў фабрычных умовах. У асноўным гэтым займаліся майстры-адзіночкі. Такім майстрам-самародкам быў музычны майстар Белдзяржфілармоніі Крайко Уладзімір Андрэевіч. Інструментамі, выраблёнымі ім, былі укамплектаваны амаль усе народныя аркестры, у тым ліку і Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя І.І.Жыновіча.

Прадаўжальнікам справы Крайко У.А. зараз з'яўляецца яго вучань Уладзімір Пузыня, выхаванец нашага універсітэта.

У цяперашні час, калі Рэспубліка Беларусь набыла сваю незалежнасць і пачалося адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры, паўстала пытанне аб прафесійнай падрыхтоўцы музыкантаў-выканаўцаў на народных духавых інструментах. Гэту ганаровую справу ўзялася вырашаць кафедра духавой музыкі Беларускага універсітэта культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ